■ Сталічны час

# ЗА «КІЕЎСКІ СКВЕР» І СУПРАЦЬ «КОЗЫРАВА»



## Як мінчане хочуць назваць новыя станцыі метро

**Назвы станцый для чацвёртай лініі сталічнага метро Мінгарвыканкам зацвердзіў яшчэ практычна год таму. Аднак апублікаваная ў верасні рэдакцыя генплана Мінска ўнесла свае карэктывы ў праектаванне новай веткі. Так, многія станцыі памянялі сваё месцазнаходжанне, а іх назвы, адпаведна, — страцілі сваю актуальнасць. Нядаўна былі новыя прапановы па найменні, але, як аказалася, не ўсе з іх задавальняюць мінчан.**

### Я галасую...

Як растлумачыў **намеснік галоўнага інжынера Дырэкцыі па будаўніцтве Мінскага метрапалітэна Дзяніс ЗАБАЛОТНЫ,** па рэгламенце на працягу двух тыдняў пасля публікацыі гараджане могуць адправіць свае заўвагі і прапановы ў іх установу. І сапраўды, некалькі лістоў і па пошце, і па факсе прыйшло: некаторыя проста выказвалі сваё адабрэнне, некаторыя — уносілі невялікія карэктывы ў прапанаваныя назвы. Паколькі тэрмін скончыўся, вынікі ўжо падведзены: уся інфармацыя будзе накіраваная камісіі па найменні і перайменаванні праспектаў, вуліц, плошчаў і іншых складовых частак г. Мінска, якая на сваім пасяджэнні і прыме канчатковае рашэнне.

Аднак Мінгарвыканкам вырашыў не абмяжоўвацца такой складанай схемай збору грамадскай думкі, пайшоў далей і арганізаваў адкрытае галасаванне на сваім сайце, якое яшчэ працягваецца. Мінчан пытаюцца пра тое, як яны ставяцца да варыянтаў назваў дзевяці будучых станцый. Адказаць можна «падтрымліваю» ці «не падтрымліваю» або прапанаваць свой варыянт. У перспектыве чацвёртая лінія стане кальцавой, а значыць — загружанай, так што ўсё, што з ёй звязана, выклікае ў гараджан жывую цікавасць. Пакуль на абмеркаванне вынеслі ўчастак, які пройдзе пад Другім кальцом па вуліцах Дзяніcаўскай, Аэрадромнай і праспекце Пушкіна.

### Натхненне ад чыгункі і «дрэннага надвор'я»

Спадабалася жыхарам сталіцы назва «Кіеўскі сквер» — станцыя павінна з'явіцца на скрыжаванні вуліц Арлоўскай і Гая, за такі варыянт прагаласавалі 73% рэспандэнтаў. Усё лагічна: побач аднайменны парк, кінатэатр «Кіеў» і бульвар Тараса Шаўчэнкі, да таго ж у самой сталіцы Украіны станцыя «Мінская» існуе ўжо каля 35 гадоў.

А вось назвы «Козырава» і «Лакаматыўная» атрымалі менш за ўсё падтрымкі — па 43% галасоў. Дарэчы, яны абедзве так ці інакш звязаныя з чыгункай. Калі сучасным мінчанам слова Козырава не гаворыць практычна нічога, то ў XIX стагоддзі ўсе ведалі раён, у якім жылі пераважна сем'і чыгуначнікаў. Як мяркуецца, зараз Козырава «адновіцца» на вуліцы Велікаморскай, што ў раёне чыгуначнай станцыі «Мінск Паўднёвы». З «Лакаматыўнай» — паблізу чыгуначнай станцыі «Сталічная» — яшчэ прасцей: непадалёк дэпо. Наогул чыгунка адыграла ключавую ролю ў развіцці Мінска, які са сціплага павятовага гарадка ператварыўся ў значны транспартны вузел.

Менш за палову галасоў набраў і варыянт назвы станцыі на скрыжаванні вуліцы Панамарэнкі і праспекта Пушкіна «Тучынка». Магчыма, з-за аддаленай асацыяцыі з дрэнным надвор'ем. Насамрэч, так у даваенныя гады ў народзе звалі раён, дзе размяшчаліся цагляныя заводы. А вось фальварак і вёска з такой назвай яшчэ раней былі ў раёне цяперашняй вуліцы Гусоўскага. У мінулай рэдакцыі найбліжэйшую станцыю хацелі назваць Харкаўскай, а мясцовым жыхарам па душы і наогул трэці варыянт — Мядзвежына.

Мабыць, самая сучасная назва «Мінск-Мір» атрымала падтрымку 65% прагаласаваўшых. Тут таксама няма ніякіх прамудрасцяў: так называецца мікрараён, які будуецца паблізу ад вуліцы Аэрадромнай.

### На аднайменнай вуліцы, але не ў гонар яе

Палова рэспандэнтаў прагаласавала «за» назву «Цівалі» для станцыі, якая з'явіцца на скрыжаванні вуліц Прытыцкага і праспекта Пушкіна. Мілагучная назва сыходзіць каранямі ў сярэдзіну XIX стагоддзя. Першы і па гэты дзень галоўны парк Цівалі з'явіўся ў Капенгагене, пасля чаго падобныя месцы адпачынку сталі ўзнікаць у многіх еўрапейскіх гарадах. У Мінску пабудавалі фальварак «Цівалі», дзе знаходзіліся рэстаран, летні тэатр, а таксама адзіны ў горадзе вятрак. На доўгія гады прадмесце стала цэнтрам культурнага жыцця горада. Дзіўна, але ў савецкія гады слова захавалася ў назве калгаса, і толькі ў 1970-я ў сувязі з забудовай горада на некалькі дзесяцігоддзяў знікла з ужытку.

Па 60% набралі назвы станцый «Політэхнічная» — скрыжаванне вуліц Сурганава і Якуба Коласа — у гонар размешчаных тут карпусоў БНТУ, былога політэхнічнага інстытута, «Альшэўская» і «Берасцейская» на скрыжаванні вуліцы Альшэўскага і праспекта Пушкіна і вуліц Уманскай і праспекта Дзяржынскага адпаведна. Варыянтаў, чаму з'явілася назва «Берасцейская», у мінчан шмат: тут і царкоўная унія, і кінатэатр «Бярэсце», і выезд на брэсцкую шашу, праўда, да месцазнаходжання станцыі прамых адносін яны не маюць. Затое замянілі варыянт «Праспект Дзяржынскага», які не надта спадабаўся гараджанам.

Калі вы думаеце, што «Альшэўская» адсылае да назвы вуліцы, то вы памыляецеся. Сапраўды, першапачаткова быў прыняты такі варыянт, аднак потым вырашылі сакцэнтаваць увагу на больш ранняй гісторыі Мінска. Менавіта тут знаходзілася невялікая вёска Альшэва, якая потым стала Альшэўскай вуліцай горада. Аднак савецкія ўлады выкарыстані «ўдалую» магчымасць і далі вуліцы нібы новую, а нібы і не, назву ў гонар Героя Савецкага Саюза Мікалая Альшэўскага. Станцыя метро закліканая захаваць зніклы тапонім.

Толькі 3% апытаных прапанавалі свае альтэрнатыўныя назвы. Усе меркаванні будуць улічаны, а канчатковае рашэнне прынята ў найбліжэйшы час. Праўда, пакуль самай актуальнай застаецца станцыя «Чаканне», бо ўзводзіць чацвёртую лінію метро пачнуць бліжэй да 2030 года.

**Дар'я КАСКО.**
*kasko@zviazda.by*

■ Бяспечнае лета

# НАВУЧЫЦЬ, ЗАБАЎЛЯЮЧЫ

**У Віцебску прэзентавалі другі ў краіне Цэнтр бяспекі. Яго прызначэнне — навучыць правільным паводзінам у экстрэмальных сітуацыях.**

Як паведаміў **міністр па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь, генерал-лейтэнант унутранай службы Уладзімір ВАШЧАНКА,** аналагічныя ўстановы з'явяцца ва ўсіх абласцях. У перспектыве — і ў райцэнтрах. А самы першы ў краіне запрацаваў у 2015 годзе ў Гомельскай вобласці. Дзейнічае ён на базе ліцэя пры Універсітэце грамадзянскай абароны МНС. Яго наведвальнікамі за гэты час сталі больш за 40 тысяч чалавек.



Фота Віктара НІКАЛАЕВА.

Падчас адкрыцця цэнтра.

У цырымоніі адкрыцця цэнтра ў Віцебску бралі ўдзел прадстаўнікі парламента. Гасцям паказалі пакой, дзе арганізоўваюць тэматычны квест. У гульнявой форме тут вучаць выклікаць ратавальнікаў, правільна дзейнічаць падчас пажараў у памяшканнях і на двары.

Абсталяванне цэнтра дазваляе стварыць штучную маланку, імітаваць пажар з вялікім задымленнем. Мадэлююцца сітуацыі, калі трэба дапамагчы тым, хто праваліўся пад лёд, каго ўдарыла токам.

А ці ўсе ведаюць, як правільна карыстацца ліфтам? І што рабіць, калі з табой у ліфце едзе зламыснік? У Цэнтры бяспекі навучаць аптымальна дзейнічаць у розных небяспечных выпадках. Як і ратаваць, калі ў дыхальныя шляхі чалавека трапіў нейкі прадмет. Тут, наогул, навучаць першай дапамозе пры траўмах і крытычных станах. У прыватнасці, раскажуць і пакажуць, чым дапамагчы пры ўкусе змяі і насякомых, калі прахожы страціў прытомнасць, калі чалавек тоне...



Ёсць тут і стэнд з інфармацыяй пра АЭС у розных краінах. Яго мэта — паменшыць адпаведную фобію ў грамадстве, бо ў ЕС і Расіі такіх станцый дзясяткі.

Цэнтр можна будзе наведаць у складзе групы па папярэдняй заяўцы. Міністр упэўнены, што гэта месца будзе цікавым і карысным для турыстаў, бо экскурсіі сюды дазволяць пазбегнуць траўмаў і захаваць жыццё.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

■ Адпачываем!

# 48 кіламетраў на байдарках

**Фестываль воднага турызму «Мотальская рэгата» пройдзе ў гэтыя выхадныя**

**Фестываль праводзіцца другі раз. Сёлета заяўкі на ўдзел прыслалі 20 экіпажаў — з Віцебска, Брэста, Баранавічаў, Пінска, Камянца, Ваўкавыска. Прыедуць таксама каманды з Украіны і Расіі.**

На працягу двух дзён удзельнікам трэба будзе пераадолець 48 кіламетраў па рацэ Ясельда. Старт спаборніцтваў пройдзе сёння. Адчальваюць ад возера Спораўскае ў Бярозаўскім раёне і фінішуюць у аграгарадку Моталь Іванаўскага раёна. У заплыве ўдзельнічаюць байдаркі-адзіночкі, змешаныя і мужчынскія экіпажы. Увечары ў аграгарадку раскінуць палатачны лагер. Будзе арганізаваны конкурс турысцкай песні, спаборніцтвы па дартсе.

У нядзелю каманды чакае наступнае выпрабаванне: праплысці па Ясельдзе ад Моталя да вёскі Буса, развярнуцца і веславаць супраць цячэння ў зваротным кірунку. А для гледачоў падрыхтавана спартыўна-культурная праграма. Ім прапануюць згуляць у пляжны валейбол, міні-футбол, паказаць сябе ў мастацкім кіраванні байдаркай і веласіпедам, паслухаць выступленні творчых калектываў.

Пераможцаў і прызёраў рэгаты вызначаць па суме вынікаў двух дзён. Арганізатары фестывалю — Іванаўскі райвыканкам, эколага-краязнаўчае грамадскае аб'яднанне «Ясельда» і ўпраўленне спорту і турызму Брэсцкага аблвыканкама.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

■ А не шкодзь!

# Карась сапраўды атрымаўся «залатым»...

**У Шумілінскім раёне работнікі Гарадоцкай міжрайінспекцыі затрымалі браканьера з сеткамі, які прамышляў на возеры Машно каля вёскі Прыазёрная.**

Як расказалі ў Дзяржінспекцыі, трыма сеткамі даўжынёй 130 метраў парушальнік вылавіў 50 асобін залатога карася і яшчэ восем іншых рыбін. А ў Віцебскай вобласці ўсё яшчэ дзейнічае нераставая забарона (па 8 чэрвеня ўключна) і трайныя таксы за незаконна вылаўленую рыбу. Адпаведна, улоў абышоўся браканьеру амаль у 22 тысячы рублёў. Залаты карась — абарыгенны від і ў адрозненне ад сярэбранага (завезенага) ацэньваецца нашмат даражэй, у перыяд нерасту — па 414 рублёў за кожную асобіну. Вырашаецца пытанне крымінальнай адказнасці мужчыны.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*